**Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і**
М 54 **літаратуры ў школе і ВНУ**: зб. навук. арт. / пад рэд. І. У. Таяноўскай,
Т. В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – Вып. 5. – 110 с.

***Н. Б. Рашэтнікава***

# ШМАТАСПЕКТНАСЦЬ ПАДЫХОДАЎ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СТАРШЫХ КЛАСАХ

У кнізе "Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове" прафесар Васіль Ульянавіч Протчанка адзначыў неабходнасць пошуку шляхоў удасканалення навучання – выхаваўчага працэсу. Навуковец асабліва падкрэсліваў, што "настаўнікі-практыкі чакаюць ад педагагічнай навукі канкрэтнай арганізацыйнай і навукова-метадычнай дапамогі" [1, с. 3]. Гэта палажэнне мае непасрэдныя адносіны і да вывучэння ў сярэдняй школе беларускай літаратуры. Навукоўцы і настаўнікі-практыкі актыўна распрацоўваюць новыя метадалагічныя і метадычныя падыходы да вывучэння мастацкіх твораў у сярэдняй школе, пераглядаюць падыходы да самастойнай работы на уроку літаратуры, аддаючы перавагу тым, што садзейнічаюць актывізацыі самастойнай работы вучняў, іх пазнавальнай актыўнасці. Вядзецца пошук новых тэхналогій укаранення іх у практыку навучання. Новыя падыходы скіраваны на інтэрпрэтацыю мастацкага твора на розных этапах літаратурнай адукацыі.

Вызначэнне кіруючай дзейнасці абумоўлена Канцэпцыяй, а таксама патрабаваннямі школьнай практыкі. Калі гаварыць пра кантэкстуальныя падыходы, то неабходна разгледзіць працэс рэалізацыі ў школьнай практыцы і метадычнай навуцы асноўнага прынцыпу, згодна з якім беларуская літаратура вывучаецца ў кантэксце сусветнай. Вызначаны прынцып не страціў сваёй актуальнасці і сёння, нягледзячы на складанасць рэалізацыі ў практыцы выкладання, пра што сведчаць назіранні і аналіз публікацый у педагагічным друку.

Больш таго, значэнне яго будзе ўзрастаць па меры збліжэння розных адукацыйных сістэм у свеце. За апошнія пяцьдзесят гадоў адбыліся шматлікія трансфармацыі свету. Народы на нашай планеце ўсё больш залежаць як непасрэдна ад суседзяў, так і ад тых, хто жыве на іншых кантынентах. Чалавек паступова становіцца асноўнай пагрозай для Homo sapiens, што сёння не могуць ігнараваць сістэмы адукацыі. Прымаюцца ўсе праблемы і выклікі свету. Сёння неабходна навучыць чалавека разумець прадстаўнікоў іншых нацый. Вырашыць задачу дапаможа сістэма літаратурнай адукацыі, дзе нацыянальная літаратура ўпісана ў сусветны літаратурны кантэкст. Адсюль значнасць параўнальных і тыпалагічных падыходаў як у працэсе вывучэння мастацкіх твораў на ўроках літаратуры, так і азнаямлення з культурнымі эрамі, напрамкамі ў працэсе азнаямлення школьнікаў з сусветным літаратурным працэсам у старшых класах.

Тыпалагічнае, параўнальнае вывучэнне літаратуры развіваецца з канца XIX стагоддзя ў еўрапейскім літаратуразнаўстве на ўласцівых яму законах і мае сваю гісторыю ў часе і прасторы нацыянальных літаратур.

У XX стагоддзі даследаванні літаратуразнаўцаў сталі актыўна выкарыстоўвацца настаўнікамі-славістамі ў практыцы выкладання. Эфектыўнасць падобнай працы тлумачыцца неабходнасцю пераносу ведаў і ўменняў школьнікаў на новы матэрыял, без чаго немагчымы працэс фарміравання чытацкіх уменняў і ў выніку – развіццё літаратурных здольнасцей.

Параўнальнае вывучэнне літаратур (згодня з Канцэпцыяй) закладзена ў праграмах і падручніках па беларускай літаратуры. У працэсе вывучэння гісторыка-літаратурнага курса ў старшых класах вучні разглядаюць творчасць пісьменнікаў і канкрэтныя мастацкія творы ў некалькіх колах кантэксту: у кантэксце айчыннай літаратуры, блізкародасных і сусветнай. На паглыбленым узроўні ў кантэксце сусветнай мастацкай культуры, што не можа быць для школьнікаў нечаканым, бо літаратурныя сувязі прасочваюцца на ўроках літаратуры на працягу ўсяго школьнага курса. У старшых класах культуралагічны падыход неабходны, паколькі інакш не можа адбыцца знаёмства з культурнай эрай. Так, напрыклад, на ўроку, які прысвечаны эпохе Адраджэння, настаўнік прапануе ўвазе школьнікаў рэпрадукцыі твораў, фатаздымкі жывапісу, скульптуры, архітэктуры, фрагменты выказванняў мастакоў эпохі. Інакш нечым патлумачыць, у чым канкрэтна адлюстраваўся культурны рух, які распачаўся ў сярэдзіне XIV стагоддзя ў Італіі. Школьнікам складана будзе ўявіць і зразумець гуманізм і аптымізм людзей Адраджэння. Параўнанне твораў мастакоў Сярэднявечча і Адраджэння наглядна патлумачыць старшакласнікам, як рэалістычны падыход да рэчаіснасці, які характэрны для паэзіі і прозы Адраджэння, адпавядае з'яўленню ў жывапісе ракурсу і перспектывы, што кардынальна змяняе адлюстраванне людзей і рэчаў. Адпаведна мастацкія вобразы ў літаратуры пазбаўляюцца той абстрактнасці, тых застылых форм і схем у апісанні і характарыстыках, якія былі характэрны для папярэдняй культурнай эры. Ёсць і яшчэ адзін аспект.

У барацьбе з традыцыяй феадальнай культуры дзеячы Адраджэння звярталіся да антычнай літаратуры і мастацтва. Неабходна адзначыць, што пісьменнікі эпохі Сярэднявечча таксама звярталіся да Антычнасці і бралі асобныя матывы, звесткі са спадчыны культуры, часам вырваныя з яе кантэксту. Дзеячы культуры Адраджэння чыталі і вывучалі творы антычных аўтараў, звярталі ўвагу на ідэі і вобразы, свецкі дух, які панаваў у літаратуры і мастацтве Антычнасці. Вобраз мыслення вялікіх антычных аўтараў дапамагаў людзям Адраджэння пераадолець містычна-аскетычны светапогляд, што панаваў у эпоху Сярэднявечча, і пабудаваць падмурак для новага этапа ў развіцці навукі, мастацтва і прыгожага пісьменства.

Такім чынам, звяртаючыся да шырокага культуралагічнага падыходу, настаўнік актуалізуе веды вучняў (эпохі Антычнасці і Сярэднявечча), дае магчымасць убачыць шырокую панараму развіцця мастацкай культуры ў эпоху Адраджэння, паказвае агульнае і адметнае, што характарызуе кожную культурную эру. У выніку работы на ўроку старшакласнікі ў стане самастойна ахарактарызаваць чалавека Адраджэння.

Ім зразумела, што гэта гуманіст, які прагне ведаў, імкнецца зрабіць адкрыцці ў разнастайных сферах жыцця. Такім чынам вучні атрымліваюць ключ да разумення дзейнасці і творчасці выдатных прадстаўнікоў беларускага Адраджэння – Францыска Скарыны і Міколы Гусоўскага, бо культура дае код, які дазваляе прачытаць, успрыняць, зразумець мастацкі твор і творчую індывідуальнасць пісьменніка. Усе значныя мастацкія творы пісаліся ў рэчышчы вызначанай культурнай традыцыі, якую вучні павінны ведаць і разумець.

Тыпалагічны падыход да праблемы як базавы засяроджвае нас на пошуку асноўнай, інварыянтнай мадэлі, што з'яуляецца падмуркам для агульнага руху літаратурнага працэсу. У якасці матрыцы могуць быць выкарыстаны літаратурныя мадэлі, якія маюць якасць тыпалагічна паўтарацца. Выбудоўваюцца параўнанні, якія можна множыць і множыць.

Часам у літаратуразнаўстве і методыцы выкладання літаратуры такія параўнанні называюцца дыялогам культур (тэрмін М. Бахціна). Мы прывядзем прыклад не вельмі характэрны для адпаведных прац, але які дазваляе растлумачыць вучням своеасаблівасць развіцця нацыянальнай літаратуры. Спашлемся на раздзел у эксперыментальным вучэбным дапаможніку для 11 класа, дзе Л. К. Тарасюк у тэме "Францішак Багушэвіч" тлумачыць эстэтычныя погляды мастака слова, прыводзячы аналогіі паміж публіцыстычнай "Прадмовай" беларускага паэта і літаратурным маніфестам французскага паэта XVI стагоддзя Жаашэна дзю Бэле "Абарона і ўстанаўленне французскай мовы". Французскі паэт абураецца "на тых сваіх суайчыннікаў, якія... з такой стаічнай упартасцю пагарджаюць і адкідаюць, не міргнуўшы вокам, усё напісанае па-французску", "якія лічаць, што нашая мужыцкая мова няздольная да прыгожага пісьменства й інтэлектуальных трактатаў" [2, с. 362].

Галоўны прыём кампаратывізму – параўнанне літаратурных твораў, хоць метад можа быць паспяхова выкарыстаны і для правядзення тыпалагічных аналогій літаратурнага працэсу, заснаваных на падабенстве ў грамадскім і культурным развіцці народаў, пра што гаварылася вышэй. Кампаратывісцкі падыход забяспечвае трактоўку і разуменне мастацкага твора, на жаль, датычыцца гэта толькі тых твораў, якія маюць падобныя сюжэты і матывы. Аднак школьная праграма па беларускай літаратуры ўключае творы, што маюць падобныя сюжэты. Прыгадаем аповесць "Альпійскую баладу" Васіля Быкава, аповесць "Пастух і пастушка" Віктара Астафьева, якія маюць падобный сюжэт з трагедыяй У. Шэкспіра "Рамэо і Джульета".

Героі ў гэтых творах і іншых, напрыклад у аповесці І. Шамякіна "Гандлярка і паэт" праходзяць выпрабаванне каханнем. Выпрабаванне каханнем высвятляе, наколькі чалавечны чалавек, ступень яго дабрыні і самаахвярнасці. Параўноўваючы вобразы-персанажы на ўроку літаратуры, вучні глыбей разумеюць канцэпцыю чалавека ў творы пісьменніка, яго ацэнку падзей і ўзаемадачыненняў чалавека з чалавекам і з светам.

У творах беларускіх празаікаў ёсць матыў, якім прасякнуты творы пісьменнікаў-франтавікоў. Гэта матыў выпрабавання смерцю. Матыў

характэрны для твораў В. Быкава, І. Навуменкі, А. Адамовіча, І. Шамякіна і іншых. Быкаў у аповесці "Сотнікаў" прыгадаў, што гэты матыў узыходзіць да Новага Запавету, раскрываючы маральную барацьбу ў душы свайго героя. "Дзівацтвы" Сотнікава – гэта перамога тых высокіх каштоўнасцей, без якіх не было б жыцця. Зразумела, што параўнанне асобных эпізодаў, вобразаў-пералічэнняў, мастацкіх сродкаў адлюстравання дасць на ўроку літаратуры той імпульс, што разбудзіць "жывую" думку школьніка, прымусіць абраць ту ці іншую пазіцыю, а потым абараняць яе, – іншымі словамі, глыбока асэнсоўваць аўтарскую пазіцыю ў творы і будаваць сваю інтэрпрэтацыю мастацкага твора.

Паводзіны героя цяжка вызначыць элементарнай логікай, мэтазгоднасцю. У польскага пісьменніка і педагога Януша Корчака ёсць кніга "Кароль Мацiуш Першы", якую можна прапанаваць вучням на розных этапах літаратурнай адукацыі. На наш погляд, найбольш прадуктыўна разгледзець гэты твор на ўроках пазакласнага чытання ў дзевятым класе разам з аповесцю В. Быкава "Абеліск". Для старэйшых падлеткаў такі ўрок можа быць істотным у маральным аспекце. Твор Корчака – казка, але яго можна з тым жа поспехам вызначыць як псіхалагічны раман. Герой твора робіць асэнсаваны маральны выбар, ён гіне, але не пакідае ў бядзе сябра Фелікса. Януш Корчак раскрывае ў сваёй кнізе таямніцу: сапраўдныя людзі – гэта тыя, хто набыў мудрасць дарослага чалавека і не страціў дзіцячую шчырасць, адкрытасць.

Ёсць у кнізе Корчака важныя для разумення людзей назіранні. Пісьменнік тлумачыць, што ўсе праблемы ўзнікаюць у дзяцінстве. Таму і раіць сумны кароль Маціушу пачынаць рэформу з дзяцей, пакуль яны не паспелі стаць рабамі. Рабу незнаёмы пачуцці адказнасці за іншых, толькі свабодны чалавек можа даць іншым людзям шчасце і волю. Лёс свайго героя ў нечым паўтарыў сам аўтар. Янушу Корчаку, які ў час другой сусветнай вайны выкладаў у варшаўскім гета, фашысты прапанавалі выратаванне, але педагог не згадзіўся і загінуў разам з сваімі вучнямі ў канцлагеры. Тым самым Корчак яшчэ раз даказаў, што нельга перабудаваць свет, пакуль не пабудуеш спачатку самога сябе.

Герой аповесці Васіля Быкава Алесь Мароз мог не загінуць, калі б не пайшоў да фашыстаў. Цікавы ў гэтым сэнсе выказванні Ксяндзова, які лічыць падобны ўчынак глупствам і нават здрадаю. Алесь Іванавіч Мароз паўтарыў подзвіг Корчака, загінуў разам з сваімі вучнямі. Так ці герой ён? Менавіта на гэтае пытанне адказваюць розныя персанажы аповесці В. Быкава. Так, Мароз не забіў ніводнага немца, не вызваліў з бяды сваіх вучняў. Ісціна заўсёды больш складана вызначаецца, чым гэта можа здацца на першы погляд. І гэтую "ісціну" вышукаў, сцвердзіў і заплаціў за яе сваім жыццём вучань Мароза Павел Міклашэвіч, які перажыў тых, чые імёны на абеліску.

Журналіст, які спазніўся на пахаванне Міклашэвіча, узнавіў абставіны смерці настаўніка і вучняў.

Спрэчка ў творы вядзецца вакол пытання пра маральную адказнасць чалавека перад людзьмі і самім сабой, што сбліжае сюжэты твораў Корчака і

Быкава. Вырашаецца яна ў аповесці беларускага пісьменніка ў рэчышчы класічнай традыцыі найперш рускай літаратуры. Невыпадкова Мароз сваім вучням чытаў творы Льва Талстога, будучы ўпэўненым, што чалавек, які не чытаў Талстога, не толькі не можа быць адукаваным чалавекам, але і наогул чалавекам.

Васіль Быкаў у творы раскрыў непарыўную сувязь гераічнага і гуманістычнага, сцвердзіў, што не можа быць гераічнага без чалавечнага, без чалавечай матывацыі.Бездухоўны гераізм – гэта нонсенс. Не ўчынкамі вымяраецца чалавек, а матывацыяй учынка. Фактычна да такога ж вываду прыходзіць чытач пасля асэнсавання кнігі Януша Корчака.

Сёння кампаратывізм з'яўляецца адным з найбольш актуальных кірункаў у развіцці літаратуразнаўства ў свеце, што, як гаварылася вышэй, не можа не ўздзейнічаць на методыку выкладання літаратуры. Кампаратывістаў цікавіць паэтыка, суадносіны літаратуры з рознымі відамі мастацтваў (тэатр, кіно, жывапіс, архітэктура, музыка), сацыялогія паводзін, стэрэатыпы ўспрымання замежнікамі краіны і яе культуры, літаратурныя тэмы і міфы, інтэртэкст і інш.

Не менш важнымі для нас з'яўляюцца даследаванні, якія прысвечаны культурным узаемаадносінам Беларусі з іншымі краінамі ў гістарычным кантэксце. Так даследуецца традыцыя, выяўляюцца разнастайныя ўзаемадачыненні беларускай мастацкай культуры (куды арганічна ўваходзіць і прыгожая пісьменнасць) з мастацкімі культурамі найперш еўрапейскіх народаў. На жаль, сёння недастаткова падобных даследаванняў, што звужае магчымасці навукоўцаў і настаўнікаў-практыкаў для пабудовы сістэмы работы па вывучэнні беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай. Складанасць ёсць і пры пабудове праграм па беларускай літаратуры і пры падрыхтоўцы да канкрэтных урокаў. Хто можа сёння дапамагчы настаўніку-практыку?

На наш погляд, толькі сумесная даследчыцкая дзейнасць літаратуразнаўцаў і метадыстаў. Прыклад такой паспяховай сумеснай работы – гэта стварэнне вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай літаратуры, у якіх рэалізуецца асноўны прынцып Канцэпцыі літаратурнай адукацыі сумеснымі намаганнямі вызначаных літаратуразнаўцаў і метадыстаў. Работа толькі распачата, і мы спадзяемся ў будучым рэальна дапамагчы школе ў вырашэнні актуальных праблем навучання, выхавання і развіцця вучняў.

***Літаратура***

1. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн., 2001.
2. Беларуская літаратура: эксперымент. вуч. дапам. для 11 класа (павышаны і паглыблены ўзроўні) / пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мн., 2004.